УДК 9:331.105 (476)

**А. А. Дубовік**
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

# ДЗЕЙНАСЦЬ РАСЦЭНАЧНА-КАНФЛІКТНЫХ КАМІСІЙ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ БССР У 1920-Я ГГ.

У артыкуле разглядаецца вырашэнне працоўных спрэчак на прадпрыемствах Беларускай ССР у перыяд новай эканамічнай палітыкі шляхам стварэння і працы расцэначна-канфліктных камісій (РКК). Іх дзейнасць шырока разгарнулася з 1922 г. і накіроўвалася Наркаматам працы і прафсаюзамі. РКК стваралася на парытэтных пачатках з прадстаўнікоў адміністрацыі і фабзаўкама і з'яўлялася першай інстанцыяй вырашэння канфліктаў на прадпрыемстве і ва ўстанове. Ад таго, наколькі своечасова і правільна яна вырашала працоўныя канфлікты, залежалі прадукцыйнасць працы, агульны настрой рабочых і служачых. У дзейнасці РКК можна выдзеліць два этапы. У першай палове 1920-х гг. яны праводзілі значную працу ў інтарэсах працоўных. У канцы 20-х гг. XX ст. адбывалася аслабленне дзейнасці РКК, прымірыцельных камер і іншых інстытутаў парытэтна-трацейскага вырашэння працоўных канфліктаў па прычыне перадачы часткі іх паўнамоцтваў судовым органам, што звузіла магчымасці ўдзелу прафсаюзаў у вырашэнні пытанняў рэгулявання працоўных адносін.

**Ключавыя словы:** новая эканамічная палітыка (НЭП), тарыфна-эканамічная работа, Наркамат працы (НКП), прафсаюзы, працоўныя спрэчкі, парытэтна-трацейскае вырашэнне працоўных канфліктаў, расцэначна-канфліктныя камісіі (РКК), прымірыцельныя камеры.

**Для цытавання:** Дубовік А. А. Дзейнасць расцэначна-канфліктных камісій на прадпрыемствах БССР у 1920-я гг. // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2021. № 1 (245). С. 63–67.

**A. A. Dubovik**
Belarusian National Technical University

# ACTIVITY OF RATE AND CONFLICT COMMISSIONS AT THE ENTERPRISES OF THE BSSR IN THE 1920s

The article deals with the solution of labour disputes at enterprises of the Belarusian SSR in the period of new economic policy through the creation and work of rate and conflict commissions (RCC). Their activity has expanded widely since 1922 and was directed by the People's Commissariat of Labour and trade unions. RCC was created on a parity basis from representatives of the administration and factory commitee and was the first instance for resolving conflicts at enterprise and institution. Labour productivity and general mood of workers depended on how timely and correctly RCC resolved labour conflicts. The activity of RCC can be divided into two stages. In the first half of the 1920s they did a lot in the interests of the workers. At the end of 1920s there was a weakening of activities of RCC, conciliation chambers and other institutions of parity-arbitration settlement of labour conflicts due to the transfer of part of their powers to the judicial authorities. This narrowed the opportunities for trade unions to participate in resolving issues of labour relations regulation.

**Key words:** new economic policy (NEP), tariff economic work, People's Commissariat of Labour, trade unions, labour disputes, parity-arbitration settlement of labour conflicts, rate and conflict commissions (RCC), conciliation chambers.

**For citation**: Dubovik A. A. Activity of rate and conflict commissions at the enterprises of the BSSR in the 1920s. *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2021, no. 1 (245), pp. 63–67 (In Belarusian).

**Уводзіны.** Адным з важнейшых шляхоў рэгулявання працоўных адносін у гады НЭПа з'яўлялася тарыфна-эканамічная работа, якая ўключала ў сябе не толькі нарміраванне працы і рэгуляванне заработнай платы, але і вырашэнне канфліктных сітуацый на вытворчасці. Для ажыццяўлення гэтага кірунку дзейнасці на прадпрыемствах і ва ўстановах савецкай краіны ствараліся расцэначна-канфліктныя камісіі (РКК) з аднолькавай колькасці прадстаўнікоў прафсаюзнай арганізацыі і адміністрацыі, якія мелі роўныя правы. Дзейнасць РКК на прадпрыемствах Беларусі пакуль не стала прадметам спецыяльнага навуковага даследавання.

**Асноўная частка.** У першыя гады НЭПа было шмат працоўных канфліктаў, якія патрабавалі неадкладнага вырашэння. У чэрвені 1922 г. усім павятовым аддзелам працы БССР, якая ў той час складалася з 6 паветаў былой Мінскай губерні, быў разасланы цыркуляр Наркамата

працы (НКП) рэспублікі, якім прадугледжвалася, што ўсе канфлікты на глебе прымянення наёмнай працы павінны быць абавязкова разгледжаны на прадпрыемствах і ва ўстановах расцэнача-канфліктнай камісіяй згодна з палажэннем, надрукаваным у цэнтральнай газеце «Труд» ад 19 красавіка 1922 г. Канфлікты, якія не атрымалі вырашэння ў РКК, трэба было перадаць на разгляд канфліктнай камісіі галіновага саюзу [1, арк. 2].

9 лістапада 1922 г. на IV сесіі Усерасійскага ЦВК IX склікання быў прыняты новы КЗаП РСФСР, які дзейнічаў і на тэрыторыі БССР. Вялікая ўвага ў КЗаПе надавалася падрабязнай рэгламентацыі парадку вырашэння працоўных канфліктаў (глава XVI). Прадугледжвалася, што ўсе працоўныя спрэчкі павінны вырашацца ці ў прымусовым парадку – у спецыяльных сесіях народных судоў, ці ў парадку прымірыцельнага разбору – у расцэнача-канфліктных камісіях, прымірыцельных камерах і трацейскіх судах, якія ствараліся на пачатках парытэтнага прадстаўніцтва бакоў. РКК разглядалі толькі спрэчкі, што ўзнікалі на глебе прымянення калектыўных і працоўных дагавораў, а таксама пытанні, спецыяльна абумоўленыя ў КЗаПе. Справы вырашаліся па згодзе бакоў, а пры яе адсутнасці маглі быць перанесены ў вышэйшую інстанцыю. Спрэчкі супраць сутнасці калектыўнага дагавора, патрабаванні адмены асобных частак яго або ўключэння дадатковых умоў у калектыўны дагавор разгляду ў РКК не падлягалі [2].

У лістападзе 1922 г. Прэзідыум УсеЦСПС зацвердзіў Палажэнне аб расцэнача-канфліктных камісіях, распрацаванае НКП. Перад РКК ставіліся наступныя задачы: правядзенне ў жыццё ўсіх абавязацельстваў калектыўнага дагавора і тарыфнага пагаднення; вырашэнне спрэчак і канфліктаў, што ўзнікалі на прадпрыемствах; распрацоўка праектаў правілаў унутранага распарадку [3, с. 146]. 23 лістапада 1922 г. Саўпрафбел прыняў мясцовае Палажэнне аб РКК. Да пастаянных функцый РКК адносіліся: разгляд і зацвярджэнне разбіўкі рабочых і служачых па тарыфных разрадах; устанаўленне ў адпаведнасці з калектыўным дагаворам або тарыфным пагадненнем норм прадукцыйнасці працы ці здзельных расцэнак; правядзенне іспытаў на адпаведны вышэйшы разрад; устанаўленне парадку чарговых адпачынкаў; праверка па заяве правільнасці разлікаў па зарплаце; разгляд і вырашэнне канфліктных сітуацый і г. д. [4, арк. 5]. Але галоўным накірункам дзейнасці РКК з'яўлялася вырашэнне канфліктаў на прадпрыемствах і ва ўстановах.

РКК былі створаны на буйных і сярэдніх (больш за 30 рабочых) прадпрыемствах БССР. Прадстаўнікі прафсаюза ў камісіі прызначаліся фабзаўкамамі. На прадпрыемствах з колькасцю працуючых ад 50 да 500 чалавек у склад РКК уваходзіў член фабзаўкама і яшчэ адзін прафактывіст і два прадстаўнікі адміністрацыі. Тэрмін паўнамоцтваў РКК супадаў с тэрмінам паўнамоцтваў фабзаўкама (спачатку 6 месяцаў, потым адзін год). Спрэчкі вырашаліся па згодзе бакоў. Пры адсутнасці згоды спрэчка магла быць перанесена ў прымірыцельную камеру і ў трацейскі суд ці перададзена на разгляд працоўнай сесіі народнага суда. У адрозненне ад РКК, прымірыцельныя камеры і трацейскія суды не з'яўляліся пастаянна дзеючымі і арганізоўваліся для кожнага асобнага выпадку [5, с. 4].

Пра якасны склад рабочай часткі РКК можна ў пэўнай ступені гаварыць па звестках прафсаюзных органаў БССР. Так, на сярэдзіну 1924 г. з 717 членаў РКК (без членаў фабзаўкамаў) мужчын было 683 (95,3%), жанчын – 34 (4,7%). Пераважалі рабочыя – 402 (56,1%), служачых было 315 чалавек. Члены кампартыі складалі 21,1% (151 чалавек). Па нацыянальным складзе пераважалі беларусы – 461 чалавек [6, арк. 51, 54]. Але часам, як адзначаў старшыня ЦСПСБ Ендакоў М. Я., «у РКК выбіраюцца розныя Міцюхі (разявакі – А. Д.), якія не могуць абараняць рабочых. Гэтага быць не павінна» [7, арк. 7]. Здараліся і выпадкі, калі прафсаюз вылучаў сваіх прадстаўнікоў у РКК, аднак гэтага не рабіла адміністрацыя і таму камісія, якая павінна была працаваць на парытэтнай аснове, работу не пачынала.

РКК дзейнічалі на аснове палажэння НКП ад 3 лістапада 1922 г. Існавала і палажэнне аб РКК, зацверджанае УсеЦСПС 17 лютага 1925 г., якое прымянялася ў тым выпадку, калі гэта агаворвалася ў калектыўным дагаворы. Асноўная розніца заключалася ў тым, як прымалася рашэнне РКК – большасцю галасоў прысутных згодна з першым палажэннем ці кансэнсусам па палажэнні 1925 г. [8, арк. 9].

У працы РКК мелі месца недахопы, буйнейшым з якіх была зацяжка ў вырашэнні канфліктаў. Патрабавалася прыступіць да іх разгляду не пазней чым 24 гадзіны з моманту паступлення заявы. Але часам гэта рабілася толькі праз некалькі дзён, а то і тыдзень. Некаторыя прафсаюзныя і гаспадарчыя органы разглядалі РКК як арганізацыю, што знаходзіцца пад іх кіраўніцтвам. Такі погляд супярэчыў сутнасці і структуры РКК як парытэтнага органа. Прафсаюзныя арганізацыі з'яўляліся адным з бакоў працоўных адносін і сваё кіраўніцтва РКК маглі праяўляць толькі ў дачыненні да яе рабочай часткі. У шэрагу выпадкаў у РКК разглядаліся пытанні, якія не ўваходзілі ў іх кампетэнцыю, што ператварала РКК у адміністрацыйны орган.

Напрыклад, РКК пры Магілёўскім цэнтральным рабочым кааператыве займалася перакідкай служачых з аднаго прадпрыемства на другое. Па ініцыятыве рабочай часткі РКК завода «Звезда» ў Магілёве зніжаліся разрады работнікаў, што прыніжала аўтарытэт РКК як органа абароны інтарэсаў працоўных. Мелі месца непасрэдныя звароты працоўных у РКК без папярэдняга звароту ў адміністрацыю, як таго патрабала заканадаўства, і тым самым заводзілася справа аб канфлікце, хаця яго магло і не быць [8, арк. 10]. Здаралася, што адміністрацыя ставіла на пасяджэнні РКК пытанне аб звальненні па скарачэнні штатаў і ў рабочых складвалася ўражанне, што скарачае РКК, тым болей, што скарочаныя не маглі абскардзіць рашэнне ў РКК, якая ўжо вынесла рашэнне [9, арк. 29].

Меркаваць аб колькасці і характары канфліктаў, якія праходзілі праз РКК, таксама як аб удзельнай вазе правільных рашэнняў РКК, немагчыма ў поўнай меры, паколькі адпаведнага ўліку не вялося. Разам з тым аб апошнім можна часткова ўяўляць па рашэннях РКК, якія траплялі ў інспекцыю працы ў парадку нагляду. Па дадзеных за 1925–1926 г., інспекцыяй працы НКПБ было разгледжана 1251 рашэнне РКК. Адменена было 335 рашэнняў РКК, ці 26%. З 10 акруг БССР найменшы працэнт адмененых рашэнняў прыходзіўся на Бабруйскую акругу – толькі 6%, найбольшы – на Аршанскую і Барысаўскую акругі [8, арк. 10].

У цэлым у дзейнасці расцэначна-канфліктных камісій можна выдзеліць два этапы: работа на пачатковым этапе НЭПа і ў другой палове 1920-х гг., калі прасочваецца ўстойлівая тэндэнцыя адыходу ад нэпаўскіх прынцыпаў гаспадарання. З поўнай падставай можна сцвярджаць, што нягледзячы на памылкі ў дзейнасці РКК, да сярэдзіны 1920-х гг. яны праводзілі вялікую працу ў інтарэсах працоўных. Канфлікты вырашаліся пераважна на месцах і часта на карысць рабочых. Пачынаючы з 1926–1927 г., у СССР было ўведзена дзяржаўнае нарміраванне зарплаты, якое ставіла мэтай вызначэнне цвёрдых акладаў па бюджэце без прымянення разраднай сеткі. Яно фактычна ліквідавала значэнне РКК як расцэначнага органа, зводзіла яе функцыі толькі да вырашэння канфліктаў [10, арк. 184]. Прафсаюзы былі пазбаўлены магчымасці вызначаць нормы выпрацоўкі і расцэнкі шляхам іх узгаднення з адміністрацыяй прадпрыемстваў, паколькі вырашэнне гэтага пытання перадавалася з вядзення РКК да заводакіраванняў. Зарплата перастала ўвязвацца з прадукцыйнасцю працы, саступала росту апошняй. Рабіўся акцэнт на рэжыме эканоміі.

З другой паловы 1920-х гг. у дзейнасці РКК праявіўся адміністрацыйны ўхіл, які выразіўся ў неапраўданым зацягванні працоўных спрэчак, адсутнасці справаздачнасці, нізкай кваліфікацыі рабочай часткі РКК. У якасці асноўнай прычыны працоўных спрэчак на вытворчасці ўсё часцей выступала самавольства адміністрацыі, якое праяўлялася ва ўстанаўленні расцэнак без згоды з РКК, нявыплаце сярэдняга заробку пры невыкананні вытворчых праграм не па віне рабочых. Перманентныя парушэнні гаспадарчымі органамі пунктаў заключаных калектыўных дагавораў сведчылі аб дэкларатыўнасці дагаворных адносін ва ўмовах самапраўства гаспадарнікаў. Так, рабочы дэпо Заходняй чыгункі, член Прэзідыума ЦСПСБ Латакурскі П. К. у выступленні на VI Усебеларускім з’ездзе прафсаюзаў (кастрычнік 1927 г.) прывёў факт, што Упраўленне чыгункі змяніла расцэнкі і прыслала ў РКК на зацвярджэнне. «Мы разгледзелі і да згоды не прыйшлі. А ўсяроўна праз 2 тыдні прыйшлі гэтыя расцэнкі і ніякімі сіламі мы не маглі прыпыніць правядзенне іх у жыццё» [11, арк. 142]. Такім чынам, ажыццяўляўся перагляд працоўных норм у бок іх павышэння. Кантроль вышэйстаячых органаў за складам РКК, работа якіх дагэтуль здзяйснялася ў адкрытым парадку для членаў прафсаюзаў, быў дапоўнены абмежаваннем галоснасці. Па стане на 1 мая 1928 г., рабочая частка РКК на 1188 прадпрыемствах БССР уключала 2134 чалавекі (без уліку членаў прафкамаў). З іх упершыню было выбрана 1275 чалавек (59,7%), у тым ліку 980 рабочых (68,2%). Жанчыны складалі 13,7%, моладзь да 22 гадоў – 5% членаў РКК. Сярод членаў рабочай часткі РКК былі 664 камуністы (31,8%) і 97 камсамольцаў (4,7%). Беларусы складалі больш паловы (51,4%), яўрэі – 34,4, рускія – 7,2, палякі – 2,8% членаў РКК [12, арк. 10].

У снежні 1928 г. Наркаматам працы СССР, у адпаведнасці з пастановай ЦВК і СНК СССР ад 29 жніўня 1928 г. «Аб зацвярджэнні правілаў аб прымірэнча-трацейскім і судовым разглядзе працоўных канфліктаў» (падпісанай адным з старшыняў ЦВК СССР А. Р. Чарвяковым), былі зацверджаны новыя Палажэнні аб РКК і іншых прымірыцельных органах, якія ў асноўным захавалі парадак іх арганізацыі і дзейнасці. На рабочую частку РКК былі распаўсюджаны гарантыі, якія раней устаноўлены для членаў ФЗМК. Разам з тым пашыралася практыка разгляду працоўных канфліктаў у судовых органах [13; 14, с. 3].

У сувязі з выданнем законаў аб новым парадку разбору працоўных канфліктаў прафсаюзнымі органамі БССР былі скліканы нарады членаў рабочай часткі РКК, дзе абмеркаваны шляхі ўдасканалення работы РКК, а таксама правядзення тлумачальнай кампаніі сярод працоўных, паколькі яны не былі знаёмы з дэталямі

новага закона, у прыватнасці, са скарачэннем тэрмінаў для ўзбуджэння справы (напрыклад, 14 дзён замест трох гадоў па справах аб звальненні) [15, арк. 175]. Прэзідыум ЦСПСБ 21 сакавіка 1929 г. прыняў пастанову «Аб семінарыях для рабочай часткі РКК», дзе прызнаў мэтазгодным прапусціць увесь склад рабочай часткі РКК па Мінску праз «6-гадзінны семінарый». Для гэтага стварыць два працуючыя семінары пры ЦСПСБ, ахапіўшы ўсе саюзы за выключэннем будаўнікоў, саўгандльслужачых, медсанпрацы, працасветы і харчавікоў, якім прапанаваць арганізаваць пры саюзах такія ж семінары па праграме ЦСПСБ. Гэтую работу планавалася закончыць да 15 мая 1929 г. [16, арк. 310].

Нельга адназначна ацаніць дзейнасць РКК і ў цэлым прафсаюзных органаў у канфліктных сітуацыях у гэты час. З аднаго боку, прафсаюзы адзначалі самавольства гаспадарчых органаў і адміністрацыі прадпрыемстваў у адносінах рабочых, з другога – на этапе згортвання НЭПа назіралася імкненне прафсаюзнага кіраўніцтва ацэньваць працоўныя канфлікты як палітычныя і вырашаць іх на карысць адміністрацыі. Поўнасцю падтрымліваючы палітыку кіруючай партыі, прафсаюзы ўжо не маглі выступаць у ролі безумоўных абаронцаў паўсядзённых патрэб рабочых, паколькі стараліся ўвязаць патрабаванні працоўных з доўгатэрміновымі патрэбамі дзяржаўнай прамысловасці. Гэтым тлумачыцца своеасаблівы характар пазіцыі прафсаюзаў па працоўных канфліктах, якая вынікала са спецыфікі савецкага прафсаюзнага руху, цесна звязанага з усім дзяржаўна-палітычным укладам краіны. У выніку, выступаючы абаронцам эканамічных інтарэсаў сваіх членаў, прафсаюз разам з тым павінен быў стаяць на варце агульнадзяржаўных інтарэсаў. Дадзеную супярэчнасць у паводзінах прафсаюзаў дакладна перадаў саветолаг Э. Кар: «калі адміністрацыя і партыя заўсёды знаходзілі агульную мову, дык пазіцыя прадстаўніка прафсаюза была больш уразлівай, і таму прафсаюзы часам абвінавачвалі ў тым, што яны ідуць на повадзе ў адміністрацыі» [17, с. 147].

**Заключэнне**. Такім чынам, расцэначна-канфліктныя камісіі, пачынаючы з 1922 г., з'яўляліся першай інстанцыяй вырашэння працоўных канфліктаў на прадпрыемствах і ва ўстановах савецкай краіны. Яны выступалі парытэтнымі органамі наймальнікаў і прафсаюзаў, складаліся з аднолькавай колькасці прадстаўнікоў адміністрацыі і прафсаюза. Рабочая частка РКК падбіралася фабзаўкамамі і накіроўвалася вышэйстаячымі прафсаюзнымі органамі. Ад своечасовага і правільнага вырашэння канфліктаў у значнай ступені залежалі прадукцыйнасць працы і настрой рабочых. Нявырашаныя ў РКК пытанні разглядаліся ў прымірыцельных камерах і трацейскіх судах.

Нягледзячы на памылкі і недахопы ў дзейнасці РКК, да сярэдзіны 1920-х гг. яны праводзілі нямалую працу ў інтарэсах працоўных. Канфлікты вырашаліся пераважна на месцах і часта на карысць рабочых. Аднак у канцы 1920-х гг. у сувязі з узмацненнем адміністрацыйных метадаў кіравання эканомікай назіралася аслабленне дзейнасці органаў парытэтна-трацейскага вырашэння працоўных канфліктаў, перадача часткі іх паўнамоцтваў судовым органам, што паменшыла магчымасці ўдзелу прафесійных саюзаў у рэгуляванні працоўных адносін.

## Спіс літаратуры

1. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). Ф. 265. Воп. 1. Спр. 952.

2. Кодекс законов о труде РСФСР // Собрание узаконений и распоряжений Рабочего и Крестьянского Правительства РСФСР. 1922. № 70. Ст. 903.

3. Хлебников Д. Н. РКК (местные расценочные конфликтные комиссии). М.: Труд и книга, 1926. 175 с.

4. НАРБ. Ф. 265. Воп. 1. Спр. 950.

5. Жаров С. Примирительно-третейский порядок разрешения трудовых конфликтов. М.: Юрид. изд-во НКЮ РСФСР, 1926. 68 с.

6. НАРБ. Ф. 265. Воп. 1. Спр. 1680.

7. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. Ф. 489. Воп. 1. Спр. 10.

8. НАРБ. Ф. 265. Воп. 1. Спр. 2275.

9. Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 249. Воп. 1. Спр. 4.

10. НАРБ. Ф.265. Воп. 1.Спр. 2267.

11. НАРБ. Ф.265. Воп. 1.Спр. 2303.

12. НАРБ. Ф. 265. Воп.1. Спр. 2523.

13. Собрание законов и распоряжений Рабоче-Крестьянского Правительства СССР. 1928. № 56. Ст. 494.

14. Авдеев П. Н. Новые законы о порядке разрешения трудовых конфликтов (текст с комментариями). 2-е изд., испр. и доп. М.: Вопр. труда, 1929. 171 с.

15. Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 249. Воп. 1. Спр. 134.

16. НАРБ. Ф. 265. Воп. 1. Спр. 2436.

17. Карр Э. Х. Русская революция от Ленина до Сталина. 1917–1929. М.: Интер-Версо, 1990. 208 с.

## References


1. National archives of Republic of Belarus (NARB). Fund 265. Inv. 1. Case 952.

2. Labor Code of the RSFSR. *Sobraniye uzakoneniy i rasporyazheniy Rabochego i Krest'yanskogo Pravitel'stva RSFSR* [Collection of laws and orders of the Workers' and Peasants' Government of the RSFSR], 1922, no. 70, art. 903 (In Russian).

3. Khlebnikov D. N. *RKK (mestnyye rastsenochnyye konfliktnyye komissii)* [RCC (local rate and conflict commissions)]. Moscow, Trud i kniga Publ., 1926. 175 p.

4. NARB. Fund 265. Inv. 1. Case 950.

5. Zharov S. *Primiritel'no-treteyskiy poryadok razresheniya trudovykh konfliktov* [Conciliation and arbitration procedure for resolving labour conflicts]. Moscow, Izd-vo NKYu Publ., 1926. 68 p.

6. NARB. Fund 265. Inv. 1. Case 1680.

7. State archive of the Minsk region. Fund 489. Inv. 1. Case 10.

8. NARB. Fund 265. Inv. 1. Case 2275.

9. State archive of the Gomel region. Fund 249. Inv. 1. Case 4.

10. NARB. Fund 265. Inv. 1. Case 2267.

11. NARB. Fund 265. Inv. 1. Case 2303.

12. NARB. Fund 265. Inv. 1. Case 2523.

13. *Sobraniye zakonov i rasporyazheniy Raboche-Krest'yanskogo Pravitel'stva SSSR* [Collection of laws and orders of the Workers' and Peasants'Government of the USSR], 1928, no. 56, art. 494 (In Russian).

14. Avdeyev A. N. *Novyye zakony o poryadke razresheniya trudovykh konfliktov (tekst s kommentariyami)* [New laws on the procedure for resolving labour conflicts (text with comments)]. Moscow, Vopr. truda Publ., 1929. 171 p.

15. State archive of the Gomel region. Fund 249. Inv. 1. Case 134.

16. NARB. Fund 265. Inv. 1. Case 2436.

17. Karr E. Kh. *Russkaya revolyutsiya ot Lenina do Stalina, 1917–1929* [The Russian revolution from Lenin to Stalin. 1917–1929]. Moscow, Inter-Verso Publ., 1990. 208 p.


## Інфармацыя пра аўтара


**Дубовік Алена Аляксандраўна** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт (220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 65, Рэспубліка Беларусь). E-mail: Dubovik.elena@inbox.ru


## Information about the author


**Dubovik Alena Aliaksandravna** – PhD (History), Assistant Professor, the Department of History of the Belarusian Statehood. Belarusian National Technical University (65, Nezavisimosti Ave., 220013, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: Dubovik.elena@inbox.ru


*Паступіў 15.02.2021*